НАВІНКІ

28 лютага - 14 сакавіка 2000 №4(26) Кошт свабодны

Вашай газэце 2 гады!



Лютайскія тэзысы

Як проста і наглядна выказаць галоўную ідэю, да якой імкнуцца *Навінкі* на працягу двух гадоў свае дзейнасьці? Якога кшталту людзей намагаецца выхаваць наша выданьне? Ня трэба далёка бегаць за прыкладамі. Для гэтага зьвернемся да папулярных вобразаў герояў сэрыялу MTV – Бівіса і Батхеда.

Бівіс і Батхед сваімі здаровымі дэбільнымі рэакцыямі па ўсім сьвеце разбураюць стэрэатып паводзінаў, якія традыцыйная сыстэма намагаецца навязаць маладым людзям. Гэта не прыдуркі, як лічаць буржуазныя мэдыі, а сацыяльна дэструктыўныя пэрсанажы, якія ўвесь час зацяваюць нешта жудаснае і прыкольнае. Піраман Бівіс (Fire!) уногуле гатовы ўзарваць што заўгодна. Гэтыя мультыкі, як і наша газэта, вучаць людзей чаму ня трэба. Ня тое, што трэба – гэта акурат тое, што трэба! Гэта ўжо і ёсьць першы крок да паўстаньня супраць катэгорыяў. Трэба прыгадаць, што кадравы склад рэвалюцыйных арганізацыяў рэкрутаваўся менавіта з такіх хлапцоў. Асноўную масу акурат і складалі тыя, хто ня меў ні бабак, ні цёлак, таму бальшавіцкія агітатары хутка расталкоўвалі, што грошаў пасьля рэвалюцыі ўвогуле ня будзе, а цёлак будзе навалам. Хіба не для такіх кадраў Энгельс і Маркс прапісалі ў камуністычным маніфэсьце, што пасьля сусьветнай рэвалюцыі фэміны будуць толькі агульнымі?

На стар. 3



Віншуем з 8 сакавіка!

Падрабязнасьці адстаўкі Лінга. Расавы аспэкт.

Стар. 2

Навінкі ў самвыдаце.

Залаты архіў на

стар. 4-5 і 8

Апазыцыя рыхтуецца да Маршу Свабоды -II 15 сакавіка.

Стар. 2

Падпісны індэкс 63439

Газэта «Навінкі» выходзіць зь лютага 1998 г. Зарэгістраваная ў Дзяржаўным камітэце па друку Рэспублікі Беларусь 23.02.1999 г. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі №1272. Заснавальнікі: П.Канавальчык, А.Новікаў, А.Мазур. Галоўны рэдактар Паўлюк Канавальчык. Падпісны індэкс **63439**. Адрас для карэспандэнцыі: п/с 33, 220134 Менск, БЕЛАРУСЬ; E-mail: navinki@user.unibel.by; Адрас рэдакцыі: г.Менск, пр.газ.«Известия», 9-143.

Нумар падпісаны да друку 28.01.2000 г., а 00.55. Тыраж 5200 экз. Надрукавана з гатовых дыяпазытываў заказчыка на паліграфічнай фабрыцы «Чырвоная Зорка» ВПТ імя Я.Коласа, г. Менск, 1-ы Загарадны зав., 3. Заказ №1616

За што зьнялі Лінга

Падрабязнасьці зь біяграфіі суперніка Чыгіра

Шустры чытач ніколі не прасьпіць сьвежы нумар штотыднёвіка *Наша Ніва*, на старонках якога заўсёды можна знайсьці нешта клёвае і зэбскае.

Напрыклад, хэдлайнэр апошняга выпуску – прагон аб сапраўдных завуаліраваных матывах адстаўкі прэм'ера Сяргея Лінга. Аказваецца, што ракіроўка Лінг-Ярмошын – не прадукт бюракратычных інтрыгаў, а рэзультат расавай чысткі, што праводзяць славяна-вугорскія цэнтры супраць прадстаўнікоў беларуска-балтыйскай расы.

Жывым факелам тусоўкі апошніх быў адстаўнік Лінг. Цяпер, дзякуючы *Нашай Ніве*, усё стала на свае месцы. Відавочна, што былому прэм'еру як балту зь дзяцінства прыйшлося несалодка. Яшчэ ў ясьлях, дзе нават на гаршках быў выграваваны лэйбл «Толькі для славянскіх і вугорскіх попак», малады хлопец зразумеў, што зь ягоным балцкім шнобэлем яму ў гэтай краіне ні хера ня сьвеціць. Прыйшлося Сярожу-юнаку браць урокі ў лягапэда, каб пазьбегнуць балтыйскага акцэнту, і штучна схаваць свае беларуска-балтыйскія расавыя карані, запісаўшыся ў мэтрыцы усходнім дрыговічам.

Паталягічная балцкая працаздольнасьць адчыніла яму дзьверы на самыя высокія пасты ў краіне. Аднак і тут ён ня мог адчуваць сябе спакойна. Варагі з Расеі, якія захапілі высокія кабінэты на пл.Незалежнасьці, чмырылі ўсіх, хто не адпавядаў рурыкаўскай расавай канцэпцыі. Міністэрства крыві літаральна сачыла за кожным крокам прэм'ера. Толькі па вечарах, забіўшыся ў самы цёмны куток кватэры, ён мог на хвіліну зноў адчуць сябе балтам: паслухаць любімую Ламу Вайкуле або паглядзець шоў Урмаса Ота.

Аднак, як справядліва кажуць, колькі вяроўцы ні віцца... У рэшце яго застукалі за пакупкай клайпедзкіх шпротаў. Адразу, натуральна, узьнікла падазрэньне: нашто табе галімая рыба, калі ёсьць сібірскія пяльмені. Той адмазваўся, што ў крыві не хапае фосфару. Калі пачаліся больш шчыльныя праверкі, уся старая легенда Лінга рухнула, як картачны домік. Аказалася, што ў Лінга папросту балцкая кроў, што патрабуе нямерана фосфару. Прэм'ера вывелі на чыстую ваду як агента балцкіх спэцслужбаў. Спачатку сынэдрыён славяна-вугорскіх мудрацоў плянаваў зрабіць рытуальнае забойства, аднак потым вялікадушна абмежаваўся адстаўкай.

To be continued...●

Ян Станкевіч

Тэст адпаведнасьці славяна-вугорскага чэрапу патрабуе абшырнай лабатаміі

На сустрач Маршу

Адзін дзень з жыцьця палітычнага адмарозка

15 сакавіка. Вечар. На кухні поркаецца жонка, пазіраючы час ад часу на гадзіньнік. Паварот ключа ў дзьверах. Заходзіць стомлены муж. Ён – прафэсійны палітычны адмарозак.

Жонка: Нарэшце! Я ўжо хваляванца пачала. Цёмна ўжо, думаю, на вуліцах апяроў шмат. Ты ўжо саўсім прыйшоў?

Палітычны адмарозак: Да фіг яго ведае. Яшчэ могуць патэлефанаваць.

Жонка: Ох, праца, праца...

Дапамагае зьняць бандану, ставіць арматуру ў кут.

Жонка: Ну, як гэта было?

П.А.: Зьмена як зьмена. Напрыканцы, праўда, халтурка падвярнулася.

Жонка: Сьмецьце ня вынесеш?

П.А.: Прабач, Любка. Я нешта руку пацягнуў – накідаўся каменьняў за дзень..

Жонка: Бедны ты мой, бедны! Распавядзі хоць, што вы сёньня нарабілі?

П.А.: Шапку вось сарвалі зь мянцяры – Вову будзе, калі вырасьце. Потым паўдні ўсякай мелачоўкі – па вуліцах хадзілі, сьцягамі махалі, у вокна трамваяў кукішы паказвалі, мацярыліся на Луку...-Аж голас сарваў. Пакуль на мітынгу стаялі, зьмерзьлі як бобікі...

Жонка: Дык пагрэліся б...

П.А.: Ды мы гарэлкі адразу на ўправе кульнулі і пайшлі мінакоў задзяваць, пераграм там дыхаць... Ну, ведаеш як яно... А Воўка дзе?

Жонка: Зноў з сваімі БПСМаўцамі скварэчнікі стругае. Трэба ратаваць хлопца.

П.А.: Да ну?! Ну, я яму ўсыплю.

Званіць тэлефон.

П.А.: Калі мяне, скажы, што сплю ўжо. Хоць траха

Пачаўся дыялёг між уладай і апазыцыяй. Першы тур перамоваў улады выйграюць усухую.

пакемару.

Жонка: *(Здымае слухаўку)* Алё! ...Нікуды ён ня пойдзе! Сьпіць ужо! ...Я разумею праца, нікім не зьменіш? Што ў вас іншых палітычных адмарозкаў у зьмену няма? *(Прыкладвае слухаўку.)* Гэта Чыслаў звоніць. Кажа, драка ў іх там!

Палітычны адмарозак бярэ слухаўку.

П.А.: Жыве! Што там за драка? Далёка?.. Вось сволачы! І вялікая драка? Ні фіга сабе! Зараз буду!

(Кладзе слухаўку. Зьвяртаецца да жонкі.) Прыкінь! Тысяча адмарозкаў! Мачылава на праспэкце!

Жонка: *(Глядзіць у вакно.)* А я нешта нічога там ня бачу!

П.А.: Дура ты, Люба! *(Стомлена.)* Дракі пакуль няма. Мне прыказалі яе забадзяжыць.

Жонка: А пра тое, каб зарплату падняць табе твой любімы Чысел нічога не казаў! Такіх палітычных адмарозкаў як ты яшчэ пашукаць трэба! Вось звольніься – што яны рабіць будуць?!

П.А.: Ды куды я, Любка, дзенуся? Люблю я сваю працу..

Жонка: Вось яны на табе й езьдзяць. Вось Пазьняк ужо ў Варшаве каля расейскіх амбасадаў дракі арганізоўвае! А вы ж разам пачыналі!

П.А.: Ладна, хопіць! Пайшоў я. Буду позна. Калі праца папрэ, то ў мянтоўцы заначую.

Жонка: Бутэрбродаў хоць вазьмі з сабой! Зноў на галодны страўнік...

П.А.: *(Глядзіць у вакно.)* Ды я на працы перахаплю чаго-небудзь.

Жонка: Ну, шчасьліва. Сустрэнеш Вовку, гані яго дахаты. Ён урокі яшчэ не рабіў.

Палітычны адмарозак закутваецца ў бандану, бярэ арматуру і выходзіць.●

Сяржук Высоцкі

Рэха Будзёнаўску

Глыбокі дыпляматычны скандал, які разразіўся ў двухбаковых расейска-польскіх дачыненьнях, азначыўся новымі падрабязнасьцямі вакол інцыдэнту 23 лютага. Нагадаем, што невядомымі экстрэмістамі зь фізіянамічнымі прызнакамі падобнымі да польскіх студэнтаў-анархістаў быў узяты штурмам будынак расейскай амбасады ў Познані. Падобныя акцыі адбыліся таксама ў Варшаве, Кракаве, Гданьску. У адказ на гэта расейскі бок адмяніў візыт міністра замежных справаў Іванова і пагразіў Польшчы дыпляматычнай вайной. Аднак новыя акалічнасьці, якія ўсплылі падчас расьследаваньня інцыдэнту польскімі органамі, прымушаюць па-іншаму зірнуць на скандальныя падзеі. Як паведаміў камісар паліцы Станіслаў Адляніцкі, які вядзе гэтую справу, акцыю захопу амбасады сплянавалі й ажыцьцявілі зусім не польскія малакасосы, а... чачэнскія інсургенты! Аказалася, што пакуль фэдэральныя сілы дрочылі Аргунскае ўшчэльле, атрад чачэнскіх баевікоў на чале з паляўным камандзірам Асламбекам Пшэгездоўскім пранік на тэрыторыю Польшчы і ўзяў штурмам расейскую амбасаду, узьняўшы над будынкам сьцяг ЧРІ. Супрацоўнікі амбасады ледзь пасьпелі эвакуявацца, каб ня трапіць у закладнікі да баевікоў. Такім чынам, дзякуючы растаропнасьці расейскіх дыпляматаў, сарвався «генэральны плян па вызваленьні Грознага ад фэдэральных акупантаў».

Як завярае польскі бок, падчас вайсковай апэрацыі ў Познані сярод нападаўшых не было ніводнага грамадзяніна Рэчы Паспалітай. Баевікоў, добра загрымяваных пад польскіх панкаў, выдаваў моцны каўкаскі акцэнт. «Відаць, расейскія вайсковцы папросту забыліся пра Будзёнаўск. Польшча між тым – ні прычым!» – катэгарычна падкрэсьліў Адляніцкі●

КрымінАл

Дзеці-беспрэдзельшчыкі

Усплеск дзіцячага гвалту агортвае Амэрыку. Яшчэ з пачатку 2000 году сацыёлягі й педыятры забілі трывогу: колькасьць маладзёнаў, якія стаяць на ўліку ў дзіцячым пакоі паліцыі, за адзін першы месяц перакрыла рэзультаты 1999 году на 132,4%.

Калі нашыя дзеткі трушчаць майскіх жукоў і вешаюць кошак, іхныя амэрыканскія аднагодкі займаюцца больш сур'ёзнымі справамі.

Днямі брыгадка дзетак W.A.S.P. са штату Агаё дзеля забавы закідвала камянямі аўтамабілі. Падчас масакры 3 чалавекі загінула, 7 цяжка параненыя. І гэта ня ўлічваючы тых ахвяраў, якія пацярпелі ў дарожна-транспартным здарэньні, выкліканым гэтым інцыдэнтам...

Шасьцігадовы лавелас-адмарозак са штату Мічыган, прыраўнаваўшы сваю гірлу да хлопчыка з суседняй клясы пачатковай школы, расстраляў яе з бацькавага Magnum 357 49-га калібру. У пастарунку паліцыі ён патлумачыў, што нябожчыца хадзіла пад ручку з супернікам. Цяпер, паводле законаў штату, яго чакае дзіцячы электрычны стульчык (у Мічыгане няма абмежаваньняў на прыцягваньне да крымінальнай адказнасьці па ўзросьце)...

11-гадовы юнак згвалціў у вычварнай форме сваю выкладчыцу па ангельскай мове, бо тая зьнізіла яму адзнаку па дыктанту. Гвалтаўнік па-зьверску надругаўся над ахвярай, а потым над ейным трупам. Суд штату Канзас прысудзіў яму 8 гадоў зьняволеньня ў дзіцячай калёні... Гэты сьпіс дзіцячых злачынстваў можна працягваць да бясконцасьці.

У чым прычына крыміналізацыі дзяцей і падлеткаў у ЗША?

Адказ просты: каб кангрэс не транжырыў грошы на Ўсходнюю Эўропу, а заняўся б сваімі ўласнымі праблемамі, сытуацыю з падлеткавай злачыннасьцю можна было б вырашыць.

АД РАСЕЙСКАГА ІНФАРМБЮРО...

Міні-навінкі

Поп на лаве падсудных

Ціхае рэлігійнае жыццё Гарадзеншчыны было парушана гучным судовым працэсам паміж папом бераставіцкага прыходу а.Спасюком і Гарадзенскай Праваслаўнай Эпархіяй. Усё пачалося з таго, што Спасюку надакучыла тусоўка фанатаў Маскоўскай патрыярхіі, і той вырашыў далучыцца да Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы.
У адказ на гэта гарадзенская эпархія паваліла сябе, як здраджаная жонка. У мясцовым фанзіне *Епархиальные Ведомости*, які, дарэчы, выдаецца самвыдатам з парушэннем заканадаўства РБ, зьявіўся артыкул, што нібыта поп Спасюк грошы з царкоўнай касы падкрадае, прыход на бабкі разводзіць і ўвогуле паводзіць сябе непрыстойна. Спасюк, ня будзь дурны, падаў у суд. Аўтакефалы ж, ня хочучы пагоршыць сваё і так даволі хісткае становішча, пачалі пераводзіць стрэлкі і да завяршэньня справы ня хочуць прымаць падсуднага папа ў лона сваёй царквы. Спасюка кінулі. Адзіныя, хто падтрымлівае пакрыўджанага папа ў цяжкую гадзіну, – гэта... камуніст Шчукін ды тусоўка атэістаў з Фэдэрацыі Анархістаў Беларусі. Відаць, адзінае цяпер дарога айцу Спасюку – перайсьці ў леваслаўе.

Беражыце ж абрэвіятуру нашую...

У сьвежым інтэрвію *БДГ* народафронтаўскі лідэр В.Вячорка паскардзіўся на тое, што Мін'юст цягне і цягне з рэгістрацыяй БНФ. Падстава – забарона выкарыстоўваць у назьве арганізацыі слова «народны». Як абысьці юрыдычную закавырку? Не зразумела, чаму Фронт чапляецца за слова «народны». Усё адно ўсе кажуць проста – БНФ, або Фронт. Таму рэцэпт выхаду з сытуацыі вельмі просты: знайсьці эрзац слову «народны». Для гэтага разгарнем любы слоўнік, знаходзім прыметнікі на праклятую літару «н» і падстаўляем іх у назву БНФ. Можна і трэба ўлічваць і меркаваньне чыноўнікаў зь Мін'юсту. Для прыкладу, буйнейшая апазыцыйная арганізацыя можа на паперы называцца наступным чынам: Беларускі Набалелы Фронт; Беларускі Навязлівы Фронт; Беларускі Надзейны Фронт; Беларускі Надзенны Фронт; Беларускі Надзьмуты Фронт; Беларускі Надакучлівы Фронт; Беларускі Надуманы Фронт; Беларускі Надзьмуты Фронт; Беларускі Найвышэйшы Фронт; Беларускі Накладны Фронт; Беларускі Налічны Фронт; Беларускі Ніякі Фронт; Беларускі Натуральны Фронт; Беларускі Нахіваньскі Фронт; Беларускі Нашатырны Фронт; Беларускі Няголены Фронт; Беларускі Невераломны Фронт; Беларускі Недазволены Фронт; Беларускі Нечленаразьдзельны Фронт; Беларускі Начны Фронт...
Як бачым, праектаў назваў – легіён. Соль ня ў гэтым. Галоўнае, што пры любых раскладах захоўваецца гістарычная абрэвіятура БНФ.
І воўкі сытыя, і авечкі цэлыя.

Фінансы для беларускай апазыцыі

На вуліцы беларускай апазыцыі доўгачаканая фінансавая вясна. Гэта не прыгожая мэтафара. Дапамога ідзе адтуль, адкуль яе менш за ўсё чакалі: на нацыянальную рэвалюцыю ў Беларусі ня сёньня-заўтра падпішуцца вядучыя зоркі расейскага шоў-бізнэсу: Кіркораў з сваёй кіркорчыхай Пугачовай, грудаста-нагастыя СТРЕЛКІ, працаўны Майсееў і гд.
Справа ў тым, што расейскія папсавікі – вядомыя майстры тырыць у сваіх заходніх калегаў модныя фенькі і выдаваць іх за свае асабістыя распрацоўкі. А самая раскручаная апошнім часам фенька на Захадзе ў калямузычнай вобласьці – грандыёзны скандал вакол нябожчыка Ленана з нагоды 20-годзьдзя ягонага забойства. Высьветлілася, што бітлоўскі жук вёў падвойны лад жыцьця: днём булдырыў сабе на гітары нейкія куплеты паціпу «лав і піс – гэта проста заяпіс», а па начах на яго нешта находзіла бегчы ў ближэйшы банкамат, каб да самага ранку пераводзіць шалёныя лавэ на рахункі леваэкстрэмісцкай Сацыялістычнай рабочай партыі ЗША ці ірляндзкім тэрарыстам з ІРА. Вось такі быў дзівак.
«Палітычнае мэцэнацтва – апошні піск моды!» – скумекалі акрабаты. Уся маскоўская попкамарылья кінулася раздаваць сваё бабло. Ну, левых у Расеі можа яны яшчэ знайшлі, а вось дзе ў Садовым кальцы знайсьці сэпаратыстаў кшталту ІРА? Башляць бакі чачэнскім тэрарыстам у сёньняшняй Расеі нямодна. У гэтым пляне Беларусі альтэрнатывы няма. Нам павінна абламіцца кіркораўскіх грошаў. А што ён хацеў? Хочаш быць крутым – калісь!

Грамадзка-палітычная схема ўлады ў РБ



УсыстЭме

Што да чаго

Днямі распачаўся гэв. дыялёг паміж апазыцыяй і ўладамі. «Што за дыялёг? Нашто ён патрэбны?» – спытае шараговы грамадзянін. Каб было зразумела чытачу, што да чаго, патлумачым, як працуе сучасная сыстэма ўлады ў Рэспубліцы Беларусь.
Перш за ўсё трэба адзначыць, што ў нас няма падзелу на выканаўчую, заканадаўчую і судовую ўлады. Усё прасьцей прастога: існуе легітымна выбраная некалі ўлада – Прэзыдэнт, і ёсьць кучка карлікавых апазыцыйных арганізацыяў, якія толькі й мараць, каб паднапакасьціць легітымнай уладзе, а ў лепшым выпадку – стаць на яе месца. Апазыцыя ўвесь час папаўняецца за кошт звольненых чыноўнікаў-аўтсайдэраў, што даказалі сваю прафнепрыгоднасьць.

Лютаўскія тэзысы

з нагоды 2 гадавіны газэты *Навінкі*. (Са стар.1)

Новыя героі беларускага Адраджэньня ня носяць сьвіткі ці слуцкія паясы. Ад іх разіць чарнілам. І яны хочуць бабак, цёлак і дэмакратыі.

...У полавай заклапочанасьці наконт жанчын ёсьць нават вялікі рэвалюцыйны патэнцыял. Трэба толькі правільна яго выкарыстаць: сказаць падлеткам, што ў новай дэмакратычнай Беларусі рабіць «гэта» будзе прасьцей, чым выпіць шклянку вады (гл. тэорыю Аляксандры Калантай).
Нашаніўскія вэтэраны нацыянальна-дэмакратычнай справы, пабачыўшы пару сэрыяў культавага мульціка, пачнуць наяжджаць на нас: «Гэта ж тупыя амэрыканскія хуліганы, што ўдні і ўначы глядзяць тэлек (хе-хе-хе) і жруць чыпсы (хо-хо-хо). Хіба гэта героі Новай Беларусі? Чаму ў іх можна павучыцца?» Бівіс і Батхед – аўтсайдэры, і таму яны больш сацыяльна небясьпечныя, чым яшчэ адзін герой сэрыялу – выкладчык Вандэрыксан. Вось вам тыповы аналяг нашай апазыцыі, што выпісвае *Народную Волю*, падпісвае антыпрэзыдэнцкія пэтыцыі, а ніякай карысьці для справы ад гэтага няма. Затое тандэм малалетніх тупіц зь мястэчка Хайлэндз (амэрыканская правінцыя кшталту Слоніма, дзе жывуць нашыя ўроды) газэт увогуле не чытае, глядзіць ад захаду да расьсьвету музычныя кліпы і пры гэтым арганізуе такой гармідар, які ня ўчыніць і дзясятак Маршаў Свабоды. Галоўная установа B&B – крута, круцей і яшчэ больш круцей! Хіба гэта ня першая частка марксавага закону дыялектыкі?
Нядзіўна, што супраць аўтараў B&B улады мільён разоў узбуджалі крымінальныя справы за прапаганду дэструкцыйных ідэяў. Напрыклад, адзін раз нейкія падлеткі закінулі на галаву вэтэрана вістнамскай вайны шар для боўлінга, начынены пэтардамі, у іншы раз узарвалі газавую пліту. І ўсё таму, што так было ў любімым мульціку. З гэтага пачыналі ўсе рэвалюцыянэры. Прыгадаем, што Міколка Паравоз пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасьць з таго, што запусьціў гайкай у начальніка дэпо. Соо! – як сказаў бы Батхед.
У нашай краіне B&B выконваюць гістарычную місію. Яны – галоўныя куміры ўрбаністычных тынэйджэраў, што выйдуць 15 сакавіка на Марш Свабоды-2. Ні Янку Купалу і ні Севярынца цытуюць сёньня вулічныя салдаты дэмакратыі, а двух амэрыканскіх дэбілаў: «Пяльмень, глядзі які прэзыдэнцкі палац. Давай раскурожым!» – «Круга! Гы, гы гы...»
Таму лёзунг беларускай нацыянальнай рэвалюцыі сёньня адзін: «Высока ўзьнімем бел-чырвона-белы сьцяг ідэяў Бівіса і Батхеда!»
Галоўнае пытаньне – хто зможа ўцюхаць моладзі гэты сьцяг. Гэта якраз і зробяць *Навінкі*! Бяздумнае спажываньне нашых маладых суайчыньнікаў прадукцыі MTV ператварае іх у мясцовых аналягаў Бівіса і Батхеда. І гэта добра! Галоўная задача *Навінак* – стаць рупарам новай клясы – клясы беларускіх бівісаў і батхедаў – адзінай сацыяльнай групы, што па сутнасьці нефармальна рэпрэзэнтуе праграму эмансыпацыі посттрадыцыйнага беларускага грамадзтва.

Рэдакцыя

Клюб «Оскар» зачынены

Галоўнае рэцыдыўнае наступства сэксуальнай рэвалюцыі – дыктатура підарату – нядаўна праявілася й на Беларусі.
Сэксуальна інакш арыентаваныя наведнікі клюбу «Оскар» зьнялі ў арэнду сталовую заводу «Промсвязь», але абавязковага (паводле дагавору аб арэндзе) сілкаваньня заводзкіх рабочых не забясьпечылі. Пралетарыят вымушаны быў штодня цягаць з сабой на працу нязручныя клункі са шкваркамі ці прашывацца па ближэйшых крамах у пошуках таннай каўбасы падчас абедзенага перапынку, што, згадзіцеся, таксама ня выхад.
Як у песьні сьпяваецца: «Долго в цепях нас держали, долго нас голод томил...». Тым часам сэксуальныя альтэрнатыўшчыкі глушылі горкую, закусваючы яе чорнай ікрой.
Дзякуй Богу, праваахоўныя органы своечасова выявілі факты парушэньня правоў чалавека.
І вось рэзультат: 21 лютага педы пры дапамозе службы аховы Савецкага раёну былі выстаўленыя з памяшканьня рабочай сталовай.
Справядлівасьць адноўленая: рабочыя харчуюцца ў сваёй сталовай, а підары...

У НАШАЙ ПАЛАЦЕ
ВОЛЬНЫЯ МЕСЦЫ!
Расцэнкі рэклямнай плошчы:
НА 1 ПАЛАСЕ – 700 руб./см²
НА АСТАТНІХ ПАЛОСАХ – 500 руб./см²
Зьвяртацца праз пэйджэр: 2070000 для абанэнта 6159

Шаноўны зямляк!

Мы, беларуская дыяспара ў Амэрыцы, горача вітаем цябе й віншуем з надыходзячым сьвятам — 80-ай гадавінай абвяшчэньня Беларускай Народнай Рэспублікі. Ня гледзячы на тое, выпрабаванні, што зваліліся на нашую Бацькаўшчыну, мы упэўненыя ў нашую канчатковую перамогу.

Жыве Беларусь!

Беларуская дыяспара ў Амэрыцы думае пра твой заўтрашні дзень!

Навінкі №1, 1998

Школа баявых лемпардаў

Вёска Бруславічы, што на Мядзельшчыне, на першы погляд нічым не прыкметная, можа акрамя таго, што ўжо другі год займае прызавыя месцы ў раённым спаборніцтве па зборы азімых «Градзінкі». Тыя ж беларускія краявіды: лес, балота, рэчка, яры і, нарэшце, закінутыя руіны нейкага сярэднявечнага манастыру. Сёньня гэтыя рэшткі мураў і вежы служаць надзейным сховішчам мясцовым алкашам, аднак перамясьціся мы на 300-400 гадоў таму, мы б пабачылі зусім іншыя тыпажы: манахаў у доўгіх чырвоных расах, якія пад парафіяльныя званы сьпяшаюцца на раніцьнюю малітву; купцоў-чалнакоў, што вязуць з Польшчы валюту; сялянаў, якія пільнуюць у засадзе з дубінкай панакрывасмока... Гэтак, у сярэднявеччы тут быў сапраўдны эпіцэнтар жыцьця, прычым у Бруславічах быў ня проста манастыр, а адзіны ў Вялікім княстве цэнтар манахаў, дзе акрамя духоўных навук выкладалі спартовыя дысцыпліны. Звычайны дзень складаўся для мясцовых манахаў з малітвы, дзесяці-кілямэтровай прабежкі і заняткаў па вывучэньні прыёмаў г.зв. «Школы баявых лемпардаў».

Вытокі ўшколы сыходзяць у 14 стагодзьдзе, калі ў Бруславічах зьявіліся татары, хаўрусьнікі Вітаўта па няўдалым паходзе на Тамэрлана. Акрамя ятаганаў і свэтраў вузкавокія хлопцы прывезьлі прыёмы ўсходніх адзінабарстваў, якіх яны набраліся ад палонных кітайцаў і карэйцаў. Гэтыя прыёмы нейкі час былі тайнай зброяй татарскай моладзі, але хутка тутэйшыя навучыліся махацца й крычаць «КІЯ!» ня горш за суседзкіх Ахмэдаў, Махмудаў ды Ібрагімаў. З таго часу ўчастковыя ваяводы больш у вёску не заходзілі, а ўсіх сялянаў запісалі ў шляхту.

У 15 стагодзьдзі, калі пачаўся ўздым рэфармацыі, у Бруславічы пранікаюць эмісары антытрынітарыяў – прыхільнікаў радыкальнага рэфармацыйнага напрамку. Яны заснавалі каманду, якая аб'ядналася найбольш пасьлядоўных вернікаў навакольля. Сыльвэстар з-пад Століна, лідэр рэфармістаў, склаў для камуны статут, у які паміж іншым унёс абавязковыя спартовыя заняткі. Паралельна ён зрабіў кадыфікацыю мясцовых прыёмаў самаабароны і распрацаваў нешта падобнае на сучасны кікбоксінг. У хуткім часе камуна распалася, а на яе базе быў створаны бруславіцкі каталіцкі (потым уніяцкі) манастыр, які стаў нашчадкам Сыльвэстравай навукі, якую дарэчы зь цягам часу сталі называць «Школай баявых лемпардаў». Калі сучаснаму падлетку, каб лічыць сябе аматарам мастацтва самаабароны, дастаткова ведаць прозьвішча Бруса Лі ці Джэкі Чана, то для тагачасных маладых беларускіх манахаў усё было нашмат цяжэй. Перш за ўсё трэба было прайсьці пяцігадовы курс навучаньня з абавязковай летняй практыкай дзе-небудзь у чарговым паходзе на Маскву або на мяжы з татарамі на поўдні. Тыя, хто выжываў, былі павінны здаць галоўную іспыт: знайсьці балотную рысь – лемпарда й забіць яе голымі рукамі.

Бруславіцкія манахі трэніруюць прэс жывата й трыцэпсы. (З гравюры 15 ст.)

Трэба адзначыць, што сярэднявечныя лемпарды маюць вельмі мала агульнага з сучаснымі рысямі. Жывёла лемпард – прамы нашчадак шаблязубых тыграў, была амаль паўтары мэтры вышынёй у халцы й запраста перагрызала рыцара ў дасьпехах разам з канём. Прыручаныя лемпарды стваралі самую грозную зброю войска ВКЛ. Напрыклад, падчас Грунвальдзкай бітвы лемпард па мянушцы Барсік, будучы галодным, зьеў вітэ-магістра Тэўтонскага ордэну Рудольфа фон Ляндсбэрга разам з дзвума целаахоўнікамі.

Такім чынам, гэта была сапраўды небясьпечная істота, перамагчы якую было вельмі няпроста. Але для выпускнікоў бруславіцкага манастыру не існавала катэгорыі непераможных ворагаў: ужо на сярэдзіну 17 стагодзьдзя ў імпэце выпускных іспытаў яны перабілі амаль усіх лемпардаў у Беларусі. На гэты час у бруславіцкіх манахаў зьявіўся куды страшнейшы вораг; чым прадстаўнікі пароды кашачых.

Справа ў тым, што якраз тады супрацьстаяньне ВКЛ і Маскоўшчыны дасягае сваёй кульмінацыі, пачынаецца г.зв. Вялікая вайна, арэнай баявых дзеяньняў якой стала Беларусь. У хуткім часе першыя авангардныя часткі расейскіх войскаў зьявіліся пад Бруславічамі й паспрабавалі з ходу захапіць манастыр. Манахі, шчыра кажучы, не чакалі такога нахабства й былі, што называецца, засьцігнутыя ў расплох. Але потым службі культу хуткa ўзялі сытуацыю пад кантроль і паказалі захопнікам тое-сёе са свайго спартыўнага досьведу.

На жаль, гісторыя не захавала для нас шмат дакумэнтаў, якія б дапамаглі нам уявіць канкрэтныя абставіны гэтай бойкі, аднак нешта ўсё ж зьбераглося. Гэта перш за ўсё ліст ваяводы Сімяона, які ўзначальваў атрад расейцаў, да цара Аляксея Міхайлавіча: «Зело паки монахи Бруславичыския бьющца, царь государь, аки псы, особенно если ногой в рыло, а те холопы твое, хто жывой спасся, самодержецъ инвалиды какъ одинъ есть». Хутчэй за ўсё ліст ваяводы зрабіў пэўнае ўзьдзеяньне на цара, бо наступным разам, ён асабіста павёў сваіх стральцоў на штурм Бруславічаў. Амаль 2 тысячы салдатаў пачалі аблогу манастыра. Нягледзячы на відавочную людзкую перавагу й артылерыйскую падтрымку, прымусіць манахаў здацца аказалася ня гэтак проста. Яны ўпарта адбівалі спробы штурму й пэрыядычна праводзілі вылазкі. Гэтыя вылазкі былі вельмі небясьпечныя для стральцоў, бо, як правіла, яны праходзілі ўначы, калі пераважна адзіным сродкам барацьбы быў рукапашны бой, у якім, як вядома, манахам не было роўных.

Аднога разу манах Юрась з Пузікавічаў нават прабраўся ў апачывальню самаго «государя». На жаль, Аляксея Міхайлавіча ў пакоі не было, таму наш герой проста абмежаваўся тым, што напісаў на сьцяне «Наш дом – Вялікае княства Літоўскае, Рускае й Жмудзкае!». Разьюшаны цар паабяцаў сьцерці манастыр з твару зямлі. Аднак, як гэта ні гучыць празаічна, у які раз усё вырашыла здрада.

Толмач манастыру, нехта Сёмка з Шарыкаў, купіўся на абяцанкі цара й уначы адчыніў дзьверы манастыра. Стральцы ўвайшлі ў сутарэньні й напалі на сонных манахаў. Зразумела, што шанцы ў апошніх былі амаль нулёвыя. Падчас пагрому ўсе яны былі забітыя, а зь імі сышла ў нябыт і школа баявых лемпардаў. Праўда, сярод тутэйшых хадзілі чуткі, што маладому манашку Янку таксі ўдалося ўцякчы кудысь на ўсход, у горад Ганконг, дзе быццам ён прыняў прозьвішча Янь Вань Дань. Кажуць, што ён унёс з сабою й сакрэты «лемпардаў». Але гэта ўжо больш нагадвае прыгожую казку ●

Панцеляймон Веласіпедаў
Навінкі №1, 1998

Моніка Левінскі *клеіцца да* лідэраў беларускай апазыцыі



Вокладка часопісу Newsweek сьведчыць, што беларускі палітуцякач час дарма не марнуе

Усё ідзе да новага палітычнага скандалу, – гэтак лічыць амэрыканскі штотыднёвік *Newsweek*. У фокусе патэнцыйнага скандалу вядомая афярыстка Моніка Левінскі з сваімі незадаволенымі сэксуальнымі пачуцьцямі. Не пасьпеў заціхнуць скандал адносна таго, што Біл Клінтан меў з Монікай нейкія сэксуальныя кантакты, як усё пачалося ізноў. Чарговай ахвярай заклапочаных амэрыканкі стаў Зураб Станіслававіч Хмызьняк – адзін зь лідэраў беларускай апазыцыі, які зараз жыве ў эміграцыі ў ЗША.

Як пішуць амэрыканскія бульварныя газэты, сустрэчы Зураба й Монікі набылі падазрона пастаянны характар. Гэта пачалося 2 тыдні таму падчас прыёму з нагоды адкрыцьця Беларускага Цэнтру Шпіёнаў – новага аддзелу ў структуры ЦРУ. Моніка ў першынство пабачыла тады ільвіную шавялюру, моцныя біцэпсы й трыцэпсы Хмызьняка й закахалася ў яго зь першага позірку. Некалькі дзён яна літаральна не давала Зурабу праходу сваімі надакучлівымі заляцаньнямі. У рэшце рэшт ён здаўся.

Дарэчы, бурнае сэксуальнае жыцьцё для Зураба на парадку дня. Дастаткова прыгадаць, што ў шэрагах роднай партыі «Беларускі Народны Тыл», вядомай сваімі сэксуальнымі монстрамі, яго завуць «Неўтаймавальны бусьлік». Раман працягваецца, і вынікам яго будзе хутчэй за ўсё маштабны скандал, які шмат што зьменіць у складанай сытуацыі вакол Іраку ●

Па матэрыялах часопісу Newsweek
(Навінкі №1, 1998)

Гавары Мойшква *Разгаварывай Расея!..*

Ад Курылаў да Палабаў усё прагрэсіўнае славянскае чалавецтва толькі тое й робіць, што скланяе імя мужнага генэрала Макашова, які першым адважыўся сказаць праўду аб сучаснай сытуацыі ў Расеі. Сэнс ягоных словаў «Расея прададзеная жыдам!» траўрным рэхам адгукнуўся ў самых інтымных кутках кожнай загадкавай славянскай душы. Аб таргах Расеяй, аб буднях невыноснай юдзейскай акупацыі, аб злавесных плянах сіёнскіх мудрацоў чытайце ў спэцыяльным рэпартажы карэспандэнта *Навінак* з Масквы.

У дарозе

Яшчэ ў цягніку «Менск – Масква» я зразумеў, што буду шкадаваць аб гэтым вяжу. Як толькі вагон крануўся, пакінуўшы ззаду вакзальны пэрон беларускай сталіцы, над вухам раздаўся жалезны тон правадніцы «Хто будзе браць бялізну? Кошт – сто тысячаў беларускіх зайчыкаў, або 10 расейскіх шэкеляў». Гэтая, на першы погляд банальная, фраза аказала на мяне эфэкт добрага трылеру: кандрашка ад нарастаючай прысутнасьці нечага брутальнага і жудаснага літаральна апанаўвала мяне з кожнай гадзінай. Мой спадарожнік Іван Пятроў – чалавек славянскай наружнасьці, ветлівы і акуратны – таксама вельмі нэрвавaўся. «Кантрабанду вязу», – прызнаўся ён па сакрэту. На мытні зайшлі расейскія пагранцы – два хазары, якія са словамі «Зброя, наркотыкі, сьвінна ёсьць?» дзелавіта пачалі трэсьці клункі пасажыраў. Сабака, навысканы на пах сьвініны, ашчэрыўся на майго спадарожніка, якога тут жа, падштурхоўваючы ў сьпіну прыкладамі аўтаматаў «УЗІ», ссадзілі зь цягніка (аказалася, што ён вёз шматок сала сваім сваякам). Візу ў маім беларускім пашпарце разглядалі доўга.

«Зь якой мэтай едзеце ў Мойшкву?» Я ткнуў пад нос пагранцам запрашэньне ад Маскоўскага экзархату Беларускай Праваслаўнай Царквы. «А што, у нас яшчэ ёсьць такая царква?» – шчыра зьдзівіліся тыя, але ўсё ж адчапіліся. – «Спасу няма ад гэтых заходніх місіянэраў! Куды глядзіць Сынэдрыён на справах рэлігійных меншасьцяў?..»

Спадарожнік

У Шмаленску ў цягнік падсела першая партыя тутэйшых. Большасьць пасажыраў – простыя кібуцнікі – мелі яўна акрэсьленыя сэміцкія рысы твару. Мой новы спадарожнік доўга касіўся на мяне, пакуль, ня вытрымаўшы, не запытаўся: «Скажіце, вы ня рускі?» Атрымаўшы адмоўны адказ, той павесялеў і прадставіўся: «Беня, трактарыст. Працую ў кібуцы імя Троцкага». Слова за слова, і вось Беня гасьцінна дастае бутэльку «Яўрэйскай», каб паразмаўляць па душах. «Зусім абнаглелі гэтыя кацапы. Да чаго краіну давялі!» – абураецца Беня, наліваючы шклянку да краёў. – «А ві ведаеце, жонка-та ў Беразоўскага – руская!» Далей я даведаўся, што экстрэмісты з «Арганізацыі Вызваленыя Маскоўшчыны» на чале зь Ясірам Макашовым днямі абстралялі яўрэйскія пасяленьні на Заходнім беразе ракі Волга, а ў Сэктары Нафты зноў уведзенае надзвычайнае становішча. «А ві ведаеце апошні анэкдот пра маскалёў? Не?! Ну дык я зараз вам яго раскажу!» – Беня куляе яшчэ чарку, занюхвае мацой і пачынае: «Дык вось. Памірае стары Іваноў...» Сьмяемся Выпілі яшчэ па чарцы.

Ня ведаю чаму, можа з-за дыхаты ў купэ, але мой спадарожнік стаў зноў на мяне зло пазіраць. «А можа ты ўсё ж кацапчык?» – захмялеўшы Беня насунуўся на мяне й нечакана даў разы два па твары. «Да-а, вось яна – загадкавая расейская душа...» – падумаў я, губляючы прытомнасьць.

На Бабруйскім вакзале

Сталіца Расеі сустрэла мяне пахмурным лістападаўскім ранкам. Прама на Бабруйскім вакзале красавaўся транспарант, напісаны на русішы (адной з трох яўрэйскіх моваў): «Не поверите! Мойшква!» Праз галосьнікі на ўвесь вакзал разносіцца голас дыктара з характэрным пранонсам: «Внимание! Слушайте сюда. Всем лицам славянской национальности необходимо зарегистрироваться в течение 24 часов!» Народу вакол – прорва. Большасьць – яўрэі-рэпатрыянты з Амэрыкі й Ізраілю, якія вяртаюцца на сваю гістарычную радзіму. Тут жа яны атрымліваюць 3000 расейскіх шэкеляў і разьмеркаваньне на пасяленьне ў Бірабіджан. Духавы аркестар грае марш «Вяртаньне самарыцянкі». Прабіраючыся праз натоўп, я сутыкнуўся сам-насам з трыма асілкамі з пэйсамі і стылізаванымі зоркамі Давіда на рукавах. «Ша, антысэміцкая морда! Ану тармазі!» Гэта былі прадстаўнікі «Яўрэйскага Нацыянальнага Адзінства» –экстрэмісцкай сіянісцкай арганізацыі, якая наводзіць жах на мірных славянаў, што прыяжджаюць у сталіцу з Разані, каб нешта зарабіць на продажы матрёшак ці іконаў. Мойшквaўскі мэр Люшман заплюшчвае вочы на гвалт сэмісцкіх малойчыкаў і нават сам час ад часу праводзіць на рынках масавыя славянскія зачысткі.

«Што, кацап пархаты, зноў какошнікамі гандляваць прыехаў?!» – сіяніст схапіў мяне за грудкі. – «Нябось да нашых дзяўчынак клеіцься?» «Да вы што, рабяты», - спрабаваў быў адкруціцца я - «Свой я, свой! Я Мойша Мандэльштамбдт з Тулы-Авіва». «Ха! А я, напэўне, цёця Фіма з Хайфарабуску! А ну здымай штаны, паглядзім, які ты Мандэльштамбдт!» Трэба сказаць, што аддзелаўся я досыць лёгка – мяне павалілі мордай у сьнег і трохі «паабразалі» нагамі. <...>

Славянскі супраціў

У суботу ў Мойшкве камэнданцкі дзень. Увесь горад нібы вымірае. Трэба мець сапраўдную мужнасьць, каб высунуцца за дзьверы й ня быць схопленым чарговым нарадам дружыннікаў-хасыдаў. Але я маю вельмі важкія падставы для рызыкі: выпала ўнікальная магчымасьць сустрэцца з прадстаўнікамі славянскай меншасьці, чый цэнтар знаходзіцца недзе ў бездані спальных кварталаў, як кажуць карэнныя майшквічы – «в епенях» (з русіша – «у геене вогненнай»). Электрычка мэтро выплёўвае мяне на пустынную плятформу станцыі «Тэль-Авіўская», адкуль прыходзіцца яшчэ хвілінаў 40 мясіць брудны, перш чым я дабіраюся да ўмоўленага месца. Гэта звычайны студэнцкі інтэрнат універсытэту дружбы народаў імя Бэна Гурыёна, дзе жывуць замежныя студэнты: абісінцы, нігеры і, безумоўна, расейцы. Канспіратыўны пакойчык уяўляе сабой звычайную затраханую прусакамі і клапамі студэнц-кую «трёшку». На сьценах вісіць плякат «Свободу Уральским Высотам!». Проста пад ім анахарэціўся нейкі тып з пафарбаванымі ў чорны і завітымі пад барашка валасамі. Толькі праз колькі хвілінаў я пазнаў у ім вядомага лідэра славянскага супраціву Ясіра Макашова. «Не пазналі?» – задаволена ўсьміхнуўся ён. – «Канспірацыя!» Потым ён шырака, па-славянску пасадзіў мяне за стол, і мы расьпілі «караблік» гарбаты.

«Сытуацыя цяжкая», – пачаў сваю думку Ясір. – «Улады ня хочуць выконваць нашае галоўнае патрабаваньне: прадставіць для рускіх нацыянальна-культурную аўтаномію. Ну нічога, яны пра гэта пашкадуюць». У вачах Макашова бліснула спрадвечная славянская хітрынка. «Слава Богу, у нас ёсьць людзі на тэлебачаньні. Зараз мы актыўна разлагаем прававерных юдзеяў патокам сэксу, гвалту і праваслаўных пропавядзяў, якімі кішаць амэрыканскія фільмы». І сапраўды, рускія здолелі так глыбака энтрыявацца ў мясцовыя масмэдыя, што Расея на экране тэлевізараў і ў газэтах становіцца больш падобнай да славянскай краіны. Я на ўласныя вочы бачыў у перадачы «Спокойной ночи, малыши!», каго б вы думалі? Хрюшу! А што можа сказаць яўрэйскім хлопчыкам і дзяўчынкам кашэрнае рускае парася Хрюша?

Вяртаньне

Мойшкву я пакідаў са зьмяшанымі пачуцьцямі. Што чакае Расею й яе шматпакутны народ? Мае нярадасныя думкі перарваў мой новы сусед па купэ, які сеў у Воршы. Ён разьвярнуў газэту *Известия* і паглыбіўся ў чытаньне. «Ну! На можа быць!» – раптам прамовіў ён і зьвярнуўся да мяне: «Вы чулі па антысэміцкія настрої ў Расеі Гэта ж яўнае парушэньне правоў чалавека!» «Хлусьня!» – ня вытрымаў я. – «Ніхто жыдоў у Расеі не прыцясьняе! Яны там як сыр у масьле катаюцца! А вось рускім людзям там сапраўды цяжка...» «Дык Вы, баценька, антысэміт!» – сказаў незнаёмец і зацягнуў мне ў сківіцу. «Вось ён, дом родны...» – падумаў я, валячыся на падлогу вагону, які імкліва нес мяне да сталіцы Беларусі... ●

Навінкі №7, 1998

(друкуецца са скарачэньнямі)

Мільёны прававерных з усіх куткоў сьвету прыяжджаюць да Маўзалею Ульянава-Бланка, правадыра юда-бальшавіцкай рэвалюцыі

НОВАЯ МАПА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

МАШТАБ 1:750000000

Навінкі №3, 1998

СаЮз

Ашчэр уральскага нацыяналізму

Вялікія студэнцкія беспарадкі адбыліся нядаўна ў Екацярынбурзе. Прычынай да гэтага паслужыла прыняцьце Думай з падачы фракцыі камуністаў закону пра наданьне беларускай мове статусу мовы міжнацыянальных стасункаў у Расейскай Фэдэрацыі. Екацярынбургскі губэрнатар-камуніст найбольш аддана кінуўся выконваць закон: спэцыяльным ягоным загадам ва ўсіх екацярынбургскіх ВНУ быў уведзены абавязковы прадмет па беларускай мове. На першым жа ўроку студэнты вымушаныя былі замест ангельскай мовы вывучаць правапіс «у нескладовага», што выклікала абурэньне студэнцкай масы. Студэнты вывалілі на вуліцы, несучы транспаранты: «Нет насильственной белоруссизации!», «Вернуться к основам ельцинской национальной политики», «Не бросайте языка нашего русского, чтоб не здохли!» і інш. Студэнтаў сустрэлі загартаваныя сілы менскага АМАПу, якіх тэрмінова даставілі ў Екацярынбург. АМАПаўцы загналі студэнтаў у аўдыторыі й прымусілі дзекаць, цекаць і вымаўляць цьвёрдае р. Хто няправільна вымаўляў, таго білі дубінкай па галаве, прыгаворваючы: «Тожэ мне, Тарашкевич нашёлся!» Мясцовыя расейскія нацыяналісты зь «Яблока» й гайдараўцы сталі разьдзімаць крамольныя ідэі, што нібыта студэнты й бацькі маюць права выбіраць мову навучаньня. Але губэрнатар не адступае, так што ў летнюю сэсію сапрамат і тэхналёгію мэталаў екацярынбургскім студэнтам сьвецяць здаваць па-беларуску.

(Навінкі №3, 1998)

Калі ты не падпішысься на газэту **НАВІНКІ**



Мы заб'ем гэтага сабачку!

Умовы падпіскі:

на 1 месяц (2 нумары)	– 80 руб.
на 3 месяцы (6 нумароў)	– 240 руб.
на 6 месяцаў (12 нумароў)	– 480 руб.

Падпіску можна афармiць у любым аддзяленьні сувязі да 10 чысла кожнага месяца.

Наш падпісны індэкс

63439

Як можна ахаракТАРЫЗАВАЦЬ юбілейную вечарыну *Навінак*?

ПОЎНЫ АДСТОЙ!

«Дзе я?!» – крык адчаю, падзеньне ў бездань, і... я прачнуўся. Беглы агляд столі й сьценак пакою, дзе я валяўся, супакоіў – гэта не выцьвярэзьнік. Выглядае на ўласную хату. З кішэні тырчыць кавалак паперы – грошы! Не, гэта *Навінкі*. Дзе ўзяў? Купіць ня мог, бо ўсе грошы... Вядома, грошы я прапіў на сьвяткаваньні двухгодзьдзя *Навінак*.

«Мілы, ну ты ўчора і нажраўся», – першы званок ад нейкай Валі. Сказала, што ўчора падчас танцаў абяцаў жаніцца. Я адразу працьверазеў і вырашыў разабрацца. Каб управіць свае мазгі, зайшоў на піўняк. Там сустрэў Міколу, які таксама «быў учора». Міколкавы фэйс сьведчыў аб тым, што танцы ўчора былі да ўпаду.

«Разумееш», – казаў Міколка. – «Таксоўкі пад'яжджалі да «Чатырох апельсінаў», нібы «хуткія дапамогі». Раз – і чатыры цэлы адвезьлі. Налічылі каля дзьвюх соцень таксовак». «Ды там ад сілы тусавалася каля сотні людзей», – кажу. «Дык вярталіся! Паўзком, ракам, але ішлі абратна». Зразумела.

Пасьля гадзінаў блуканьняў па менскіх піўнухах, высьветлілася, што падзеі Другой Гадавіны Газэты *Навінкі* ў Менску вядомыя. Зьвесткі трапляліся розныя, часам супярэчлівыя. Але ўсе сыходзяцца на адным: адстой быў татальны.

Першае, што абразіла – не працаваў бар. Гэтага, праўда, амаль ніхто ня памятае: усе ўсё прынесьлі з сабой. У залежнасьці ад прынесенага заля «Чатырох Апельсінаў» падзялілася на тры часткі. Адныя ляжалі, другія сядзелі, а трэція рухаліся. Якія рухаліся – вадзілі хараводы і піналі тых, што ляжалі. Бо такіх было толькі двое. Сярод тых дваіх памяць нахабна намагаецца ідэнтыфікаваць і мяне. Але я адкідваю гэтую ідыёцкую думку.

Тыя, што трындзелі час ад часу са сцэны, пачалі кідацца кандытарскімі вырабамі ў публіку, загадзіўшы залю крэмам, бісквітам і іншымі ласункамі. Больш за ўсіх дасталося тым, што ляжалі. Паводле іншых зьвестак, торт ляцеў з боку публікі ў нястройны шэраг падвыпітых тыпаў на сцэне, калі тыя мямлілі нешта аддалена падобнае да «Хэпі бёздэй», і дасталося больш за ўсіх супрацоўнікам рэдакцыі. Хаця гэта ня важна. Накаціўшы яшчэ пару куфляў з Алесем Туровічам (за ягоны кошт), я даведаўся пра наступныя факты ўчорашняга шабашу. Падчас выступаў чытачоў не давалі слова тым, хто хацеў давесьці «аднабаковасьць» газэты *Навінкі*: маўляў, гоняць на апазыцыю – і словам не абмовяцца наконт аўтарытарнай улады. Тых самавукаў-аванґар-дыстаў выпіхвалі ў фае й пазбаўлялі ільготных талёнаў на піва.

Мятаньне торту, разнузданае п'янства, танцы жывата, спаборніцтвы па фігурным ванітаваньні – так уяўляў сабой г.зв. «юбілей» газэты *Навінкі*.

Чуючы гэтую лухту, я толькі пасьміхнуўся: вядома ж, на Прэзыдэнта што напішаш, адно праўду. Туровіч тымчасам хуценька перапрадаў сваю дэзу *Нашай Ніве* за столікам насупраць.

Абрынаючыся ў чарговую хвалю алькагольнага забыцьця, я пасьпяваю пераважаць і пераварыць атрыманую інфармацыю аб навінкаўскім юбілеі. На выхадзе – поўны адстой! ●

Якуб Гаўлікоўскі

Да міжнарОднага ДнЮ жанчЫн

Мужчыны й казлы

Мужчыны й казлы вельмі розьняцца адзін ад аднога, але паміж імі існуе шэраг пераходных формаў, якія можна аднесьці і да тых, і да другіх. Такім, напрыклад, зьяўляецца казёл адпушчэньня, у асобе якога прысутнічаюць рысы казла, але, тым ня менш, ён застаецца мужчынай.

Амаль усе асобіны сямейства казлоў ня маюць уяўленьня аб сваёй прыналежнасьці да гэтага роду жывёлаў, што істотна палягчае ім жыцьцё ў цяжкіх гарадзкіх умовах. У Беларусі пражываюць наступныя віды гэтага сямейства: казёл звычайны, стары казёл, рагаты казёл і казыліна.

Усе пералічаныя віды казлоў у большасьці сваёй халяўшчыкі і выжываюць за кошт наіўных і нявопытных асобаў, якія па прычыне сваёй абмежаванасьці дазваляюць ім карыстацца прадуктамі спажываньня без наяўнага кантролю са свайго боку. І ўсе казлы вельмі добра прыстасаваны да такога тыпу жыцьця і выдатна хлусяць, што дазваляе ім доўгі час падтрымоўваць імідж «свайго ў дошку». Зьняць маску з казла вельмі цяжка – для гэтага трэба валодаць навыкамі й прыёмамі, якія дапамагаюць раскрыць усе тыя няўлоўныя адзнакі, што характарызуюць мужчыну як прадстаўніка сямейства казлоў.

Амаль усе казлы здольныя да размнажэньня полавым шляхам (у тым ліку і большасьць асобінаў, якія звычайна размнажаюцца бясполым шляхам). У казлоў звычайных «заляцаньні», альбо шлюбныя паводзіны, што прыводзяць да апладатварэньня, зьведзеныя да мінімуму. У рагатых казлоў яны часта бываюць больш складанымі ў выніку іхнай недальнабачнасьці й адсутнасьці жаданьня ў жаночай асобіны. Шлюбныя паводзіны казьліны вызначаюцца ўзаемадзеяньнем памiж вонкавымі й гарманальнымі стымуламі. Старыя ж казлы звычайна да полавага размнажэньня наогул ня здатныя.

Казлы ня могуць сынтэзаваць неабходныя ім пажыўныя рэчывы без патрэбнай апрацоўкі. Для гэтага яны выкарыстоўваюць недалёкую жаночую асобіну, якая валодае магчымасьцю атрымліваць з навакольнага асяродзьдзя арганічныя рэчывы і ператвараць іх у тыя спалучэньні, якія арганізм казла здатны засвойваць. Спажываньне ежы – неабходнасьць, чым больш часу і энэргіі жаночая асобіна страчвае на здабываньне і перапрацоўку харчу, тым менш у яе часу распазнаць казла, які хаваецца пад выглядам спажыўца.

Пра чалавека часта кажуць, што ў яго пяць пачуцьцяў: зрок, слых, дотык, нюх і смак, аднак казлы валодаюць ня менш як тузінам разнастайным тыпаў органаў пачуцьцяў. Кожны зь іх спэцыялізаваны на



«Любовь зла, полюбишь и козла» – гэтая расейская прымаўка адлюстроўвае патрыярхальныя настроі сучаснай жанчыны

ўспрыняцьці пэўнага тыпу стымулаў, якія дапамагаюць казлу сярод мноства прадстаўніц жаночага полу беспамылкова выбраць самую недалёкую. Большасьць казлоў не спыняецца на адным выбары, а працягвае папаўняць свой «гарэм», у якім кожнай недалёкай жаночай асобіне вызначана яе месца ў ланцугу спажываньня.

Казёл успрымае навакольны сьвет не зусім так, як мы. Розьніца ўва ўспрыняцьці можа быць абумоўлена тым, што ворганы пачуцьцяў па-рознаму рэагуюць на стымулы, альбо тым, што інфармацыя, атрыманая ад іх, па-рознаму апрацоўваецца ў нэрвовай сыстэме. Напрыклад, рагатыя казлы бачаць сьвет зусім інакш, чым мы з вамі. Яны заўважаюць розныя непатрэбныя дэталі і ня бачаць галоўнага – таго, што недалёкая асобіна, якая жывe зь імі, перастала адносіцца да гэтай клясы жанчын, а эвалюцыянавала ў больш высокую клясу – жанчын, якія спрабуюць «зьняцца з кручка».

Такім чынам, дыяпазон формаў паводзінаў, якія могуць узьнікаць у дадзенага казла, вызначаецца ягоным генатыпам. Але большасьць формаў паводзінаў, як прыроджаных, гэтак і набытых, ня могуць нармалёва разьвівацца, калі ў адпаведных пэрыяды жыцьця казлоў яны ня будуць падпадаць пад узьдзеяньне пэўных фактараў зьнешняга асяродзьдзя. Іншымі словамі, заахвочваючы паводзіны казлоў, скіраваныя на спажываньне прадуктаў нашай дзейнасьці, мы судзейнічаем паскарэньню іхнага росту й эвалюцыі ўва ўсё болей казьліныя віды й падвіды і робім перш за ўсё нашае жыцьцё ўсё болей невыносным і запоўненым мноствам неабаснаваных комплексаў ●

Інэса Арманд

Тухлы перац

23 лютага ў клюбе «Магна» буржуі ў супрацьвагу нашым «гарачым чырвоным чылі-струкам» ладзілі свой «Сіні перац». Такога жудаснага сутарэннага паху гнілой капусты й часнаку, які з пэрыядычнасьцю да сямі парываў у сэкунду пранізваў у той дзень клюбнае памяшканьне, мне не прыходзілася чуць з часоў маёй апошняй начоўкі ў сьметнікавым кантэйнэры. На нейкі час мною нават авалодала пачуцьцё нейкай салідарнасьці, але прыроджаная нянавісьць да буржуазіі хутка ўзяла верх над «цялячымі нежнасьцямі». Рука сама сабою намацавала ўвесісты памідор, і я падрыхтаваўся да наступленьня...

Першай маёй ахвярай сталі нейкія мардатыя цёлкі з гітарамі наперавес, што спрабавалі закасіць пад пазабрачную тройню Булата Акуджавы. Бац! – па пысе адной расплылося тухлае яйка, бац! – дзьве другія ў аўце, зьбітыя велізарным гнілым памідорам. Хто наступны?..

Архіўныя, сайгонаўскіх часоў валасацікі з JASELS BAND вывалаківаюць на сцэну афрыканскія бонгі й рарытэтную домру 1952 году выпуску. Бац! – па паліраванай паверхні домры расьцякаецца яйка, бац! – на чарапкі разьлятаюцца бонгі. Нефіг супрацоўнічаць зь «сінімі»!..

На адкормленых алігафрэнах з ЦИФРОВЫХ РИТМОВ яйкі скончыліся, прыйшлося перайсьці на масіраваную бамбардзіроўку памідорамі. Адзін за адным са строю выходзяць буржуйскі дыфірамбіст Строцаў і фальклёрны спэкулянт Кірчук. Галоўнага буржуазнага ідэоляга, старога перачніка Лявона Нарушэвіча памідорамі, праўда, праняць не атрымалася, і я выкарыстаў сваю галоўную зброю – тыя самыя чылі-струкі ў молатым выглядзе. Бац! – пузаты акварыюм-Нарушэвіч ліквідаваны. «Сіняя» пераможаны! Я зьсьцягваю на дах «Магны» чырвоны сьцяг і... бац! – неўпрыкмет зьнікаю ●

Мірон Чэгевараў

Эвангельле ад Галівуду

«Акраіна»: па-за цэнзурай

Окраина

Сэкс, кроў, гвалт, спецэфэкты, троху містыкі... – чаго яшчэ можна чакаць ад амэрыканскіх фільмаў? Нават калі яны зьнятыя на біблейскую тэму. Распачаты бацькамі «Крымінальнага чытва» й «Прыроджаных забойцаў» новы супэрсэрыял «Біблія-2000» пачаў трансьлявацца й па расейскіх каналах. Хто аўтар сцэнару – адному Богу вядома. Праглядзеўшы сэрыю «Самсон і Даліла», я ні на хвіліну не засумняваўся ў касавасьці пройгрышнага на першы погляд праекту. Натуральна, большую частку фільму вэтхазапаветны герой Самсон не вылазіць з ложку сэксапільнай сьцервы Далілы. Паміж амурнымі справамі Збаўца Ізраілю мочыць філістымлянаў, выходзячы з кожнай заварухі цэленькім, як запраўскі Рэмба. Вядома, у карціне прысутнічае незамыславатая інтрыга «а-ля Бонд». Даліла – агентка філістымлянскіх спэцслужбаў. Самсона пазбаўляюць зроку й садзяць на кічу. Аднак усё скончасьца хэпі-эндам у стылі «Армагедону»: Самсон мочыць усіх злых хлопцаў і дзевак, сам гінучы пад руінамі царскага палацу. Вораг разьбіты. Ізраіль выратаваны.

Ацэньваючы такую рэжысэрскую знаходку, можна з пэўнасьцю сказаць, што Біблію ў 21 стагодзьдзі чакае другое дыханьне. Падлеткі кінуцца касіць пад накачаных Самсонаў і Давідаў. Менавіта такія фільмы, а не прымітыўная рэкляма на БТ «Закону Божага», направіць паству на верны шлях да вечных каштоўнасьцяў ●

«Окраина», 1998; студыя «Утро 2000 года»
Рэжысэр: Пётр Луцык
У ролях: Юры Дубровін, Мікалай Алянін і інш.
Працягласьць 95 хв.

«Не за сябе, за Дзяржаву крыўдна!» – кажа Паўка, адразаючы буржую галаву.

«Фільм, які выхоўвае ў пралетарыяту дух клясавай барацьбы», – сказаў пра карціну Генадзь Зюганаў

Дзіўненька мы ня радавалі нашага чытача відэанецэнзуршчынай. Нарэшце! Фільм «Акраіна», які прадстаўляем вашай увазе, ня ўтрымлівае ніводнага матнага выразу ці словаўтварэньня (за выключэньнем трохразовага «бля» ў пачатку карціны). Аднак «Акраіна» зьлёту трапіла ў чорны сьпіс пазацэнзурных і нерэкамэндаваных да пракату й відэапродажу фільмаў.

Напружаньне ад пытаньня «за што?!» ўзрастае пасьля прагляду першых 15-20 хвілінаў «Акраіны». Зьняты ў лепшых традыцыях 30-х гадоў з адпаведнай гукавой дарожкай (моднае слова «саўндтрэк» наўрад ці будзе дарэчным), чорна-белы фільм кідае ў халодную роспач.

Перад вачыма прабягаюць нарысы побыту кубанскага казацтва прыкладна часоў грамадзянскай вайны. Хударлявы скуласты твар галоўнага героя, яўна хворага на чахотку ці гепатыт С, нагадвае Паўку Карчагіна. Партызаны – акторы, вядомыя па савецкіх патрыятычных эпапеях кшталту «Трывожнае шчасьце» – забіраюць дахадзягу ў атрад мачыць старшыню калгасу, які прадаўся каапэратарам.

Пасьля невялічкай перастрэлкі старшыня трапляе ў рукі партызанаў, якія яго катуюць, дзяруць скуру на рэмні, топяць у проруві...

Нарэшце, той колесца, раскайваецца ў зробленым і запісваецца ў атрад «мачыць каапэратараў». Каапэратара шчэмяць на дачы, калі той ледзьве ня ўцёк на сваім старэнькім «масквічы». Дарэчы, са зьяўленьнем у кадры партызанскага матацыкла й «масквіча» пачынаеш нявольна пераконвацца, што падзеі адбываюцца недзе ў 50-я.

Напрацягу астатніх 100 хвілінаў героі фільму мочаць, рэжуць, гвалтуюць і мардуюць народных крывасмокаў, іхніх жонак і дзяцей. З захапленьнем заўважаючы за галоўным героем павадкі Тэрмінатара, глядач разам зь ім перажывае сцэну расплаты за параненага сябра ў выглядзе зьверскага забойства з наступным адразаньнем галавы ахвяры.

І вось народныя мсьціўцы прынікаюць у Крэмль. Прэзыдэнт Ельцын сьмяецца ў твар прадстаўнікам працоўных мас, хвалячыся сваімі нафтавымі інтарэсамі... Прэзыдэнт задушаны. Крэмль гарыць...

Заключныя кадры: узараная зямля, шчасьлівыя, але суровыя твары герояў за рычагамі трактараў. Трактар ідзе роўна і ўпарта наперад. Народ не перамагчы!

Што ў гэтым фільме нецэнзурнага – вырашаць гледачу. Мы ж прапануем вам паглядзець гэты фільм. Сачыце за нашай рэклямай ●

Вадзім Нявідзімаў

GrAmmy

Каранацыя па-эўрапейску

«Уітні Х'юстан возіць кантрабандай анашу»; «Мадона была цнатлівай дзявіцай»; «Брытні Спірс увагнала сабе ў цыцкі сылікон»; «Рыкі Марцін мае сэксуальную задніцу»; «Элтан Джон сьпіць з Джорджам Майклам»... Чаго толькі не пачуеш ад дародных бабіцаў, якая здаля нагадвае мінстыцу Левінскі і што з усяе сілы намагалася касіць пад Клару Новікаву. Плюгкія й ташнатворныя жарты прыліпалі да агідна белых зубоў канфэрансьержкі. Публіку ад ейных хохмаў, відаць, ня дужа пёрла.Фанаграма жыдзенькага рогату не магла схаваць раздражнёнасьць і напружанасьць прысутных, якія адно зайздросна радаваліся, што нехта атрымлівае за нейкую эмцівішную лабудзень пазалочаны грамафон.

Шчасьліўчыкі як адзін сыпалі прызнаваліся, што будуць гаварыць без паперкі, і тараторылі за тыдзень завучаны напамяць тэкст падзякі.

Зьдзівіла, што большасьць выканаўцаў – плягіятары й яўна касілі пад НА-НА ці РУКИ ВВЕРХ. Напрыклад, Рыкі Марцін – яўна фанат Агуціна, а калектыў тэхасскіх дзевак у стылі «кантры» – тыповыя СТРЕЛКИ. Нібы нічога, акрамя як перадзіраць расейскую папсу на заходні манер ужо ня могуць выдумаць! Было трохі крыўдна, што сярод гэтай бліскучай (у сэнсе шмотак) поп-публікі не было відаць Алсу, якой абяцалі былі пратэкцыю на гэтую тусыню.

Алсу затрымалася на дабрачынным канцэрце ў сіроцкім доме №3 г.Казань й не зьмагла прыехаць у Лос-Анджэлес. Ня ў прыклад Майклу Джэксану, які таксама не прыехаў, але зь іншай прычыны: разводзіў дзетак і зараз сядзіць да суда.

Здаля ўсё гэтае дзейства раздачы грамафонаў нагадвала ці то «Залатую Ростань» (тое ж убоства, толькі за большыя бабкі), ці то «Рок-Каранацыю» (кожны сабака ведаў, чыю костку грыз).

Радыё «Кася» нон-стоп

Адмыслова пад Касю Камоцкую створаная радыёстанцыя.

Кася Камоцкая – адзіны беларускі рокер, які ня толькі атрымаў вышэйшую адукацыю, але й напісаў кандыдацкую дысэртацыю. Ды які глузд ад навукі ці мастацтва, калі няма ад іх карысьці для простага люду? Кася паведаміла, што стамілася ад Славы – ня толькі Кораня, а ў шырокім сэнсе. Ей надакучыла гэтак званая элітарная багема, і цяпер яна хоча прысьвяціць свой досьвед народу. Так узьнікла ідэя стварэньня сапраўднай народнай радыёстанцыі. Ужо месяц, як Кася працуе на «Радыё-Кася» ў якасьці Касі. Месьціцца радыё ў Вільні, але вяшчае найперш для беларускіх сялішчаў, палёў, лясоў, рэчак, пяскоў і хмызьнякоў.

Я даведаўся пра новае радыё выпадкова, калі завітаў да сваякоў у Смургонях. Замест радаснага прывітаньня родзічы адно кіўнулі галовамі ды згрувасьціліся вакол свайго старэнькага «Акіяну». З прымача быў чутны знаёмы па рок-канцэртах голас. На адной з балтыйскіх хваляў Кася Камоцкая давала парады на кожны дзень: калі паліваць гуркі, як цыраваць шкарпэткі, як гатаваць бульбу, ды шмат чаго іншага. Затым пачалася трансьляцыя «Народнага Альбому» ў выкананьні вэтэранаў 3-га ахоўнага батальёну асобнай віленскай антыпартызанскай брыгады. Мы не пасьпелі выпіць па трэцім кілішку, як з радыё пачуўся Касін голас:

– А цяпер хто хоча, можа затэлефанаваць і спытаць чаго хоча.

Сваякі разам кінуліся да тэлефону, але ў змаганьні за слухаўку перамагла маладосьць – я.

– Алё, Кася?! Вас турбуюць з *Навінак*, з газэты. Дазвольце бліц-інтэрвію.

– Ды хоць два. А што за праблемы ў *Навінках*?

– Ды праблемы, як ува ўсіх, агульначалавечыя: дзе піва на халяву папіць, дзе адвязацца як весялей... Вы лепш пра сябе распавядзіце. Вас даўна ніхто ня бачыў.

І Кася, сапраўды, распавяла ўсё-усё, проста ў эфіры. Адзінае што, каб было весялей слухаць, яна часам перапыняла размову, каб сыграць на гітары ці распавесьці показку.

Ісьцінна народнае радыё «Кася» заваёўвае ўсё большую аўдыторыю слухачоў сярод простага працоўнага люду

Кася прысутнічае ў радыёэфіры практычна круглыя суткі. Рашэньне аб выхадзе, ці ня выхадзе ў эфір, тэматыка выступу залежаць цалкам ад Касі. Гэта ня значыць, што яна ператварыла сваю віленскую кватэру ў студыю і сядзіць там бязвылазна. Справа ў дапамозе звычайных партатыўных сродкаў спадарожнікавай сувязі. Лёзунг Касі вельмі просты: стаміўся ад справаў, зрабі паўзу – выйдзі ў эфір.

– Няўжо вы ведаеце адказ на любое пытаньне?

– Вядома. Вас цікавіць якое гледзішча на бягучыя палітычныя падзеі: польскае, літоўскае, амэрыканскае ці скандынаўскае? Мы тут сядзім у адной кавярні на віленскай вуліцы Завальнай. Калі чаго ня ведаю, дык перапытаю.

– А вы не баіцёся, што ў чымсьці можаце памыліцца?

– Дык што? Галоўнае, каб слухачам было цікава!

У гэты момант раздаўся званок па другім нумары (якіх у Касіным спадарожавіку нямала), слухач зь Вялейкі запытаўся, што рабіць, калі яго жонка выганяе з хаты, і размова пайшла ў іншым рэчышчы...

Я вярнуўся да стала. «Гэта сапраўды наша радыё – народнае», – сказалі сваякі. – «Цяпер нам ня трэба нават каляндар купляць. Сёньня «Народны Альбом» круціць – значыць пятніца, заўтра - «Верасы», тады – «Песьняры»: А самае галоўнае, цяпер, калі якая праблема – заўжды можам патэлефанаваць, ды параіцца». І мы выпілі па трэцім кілішку – за Касю. ●

Мар'ян Глушылка



ФОТА-АРХІЎ

WcDonald's

«Пралетарыят Кітаю абавязкова апаслрадуе культурныя каштоўнасьці буржуазіі. Для гэтага трэба высока несьці сьцяг дыялектычнага матэрыялізму...»

Мао Цзэ Дун

Менск. Пляцоўка каля МакДональдсу. Старыя сябры, якія ня бачыліся ўжо цэлыя суткі, зноў сустрэліся...

1 — Жывы пасьля ўчарашняга?! Што зараз будзе!.. О-о-о!!! У-у-у!!!

2 — Як даўно мы не пілі з табой піва, а?! Ну! А то ўсё гарэлка, вінішча. Яўна насыпаваў «вапрос»

3 — ...які быў вырашаны нязвычна хутка

4 — Можна было меркаваць, што дзень удаўся

5 — Канешне сходзім, вось толькі вып'ем трошачкі — і на мітынг! Мы ж таксама ў нейкім сэнсе за дэмакратыю. Сёньня нейкі мітынг, сходзім?

6 — А што гэта ў цябе, Мао, рэкляма МакДональдаў на пузе? Сябры раскласліся ў скверыку й завялі сьвецкі базар

7 — Якая рэкляма! Тут напісана МакЗабойцы, МакТрутні, МакГаўно...

8 — Страшная штука, гэтыя гамбургеры. Кажуць, што ў іх сапсеў робіць. Глупства! Гэтыя катлеты робяцца зь мяса хворых ангельскіх кароў

9 — Як здчынілі МакДональдс, у сталіцы павысіліся захворваньні на рак

10 — Во прыкол! А я думаю, што гэта Лёлік не прыйшоў. Ён учора сказаў нахаляву ў МакДональдс... Што вы пад піва ды пра ўсякую брыдоту

11 — Фігня! Падаўна двое рабочых з МАЗу акачурыліся. У страўніку ў іх знайшлі рэшткі бігмаку. Ну-у! Гэта яны хочуць усіх славянаў ператкіць

12 — Мейне Гуте! Якія вылюдкі!

13 — Спакойна, Лёлік жывы будзе. Ён жа жўрэй... ці калмык?..

Сябры адзінадушна закляймілі праклятых мультынацыянальных акул хуткага харчаваньня. Вырашана, што МакДональдсу ня месца ў краіне чаркі й шкваркі... Тымчасам піва ў бутэльках незаўважна зьнікла і паўстала праблема, як канцэптуальна дагнацца

14 — Было вырашана канвэртаваць бутэлькі ў беларускія рублі

15 — Мамань, які сёньня курс баўта?

16 — На выручаныя грошы закуплена піва

17 — Мітынг, ік?.. А, заўтра сходзім. А-э-эй эма-а эй эйчыкарайст-та, а-э-эй эма-а эй а-эпар-р-ркхайст-та!..

Потым узялі яшчэ піва... Потым яшчэ... Бо дзень, чорт пабяры, быў надта ўжо добры, хоць сонца ўжо закацілася за далягляд. Поўны расслабон і нішто не прадвяшчала нейкай напругі...

Тут нехта пра мітынг казаў

18 — Будзем здаравенныя, хочаніца стаць! Мля, факт!

19 — Трэба здліць! Е-а! Хадземце ва дваро!

І тут дала пра сябе знаць фізыялёгія

20 — Праходзячы каля МакДональдсу, хлопцы не адмовілі сабе ў задавальненьні паказаць ягоным кліентам розныя канфігурацыі пальцаў

21 — О, сымпатычная сьценачка. Запята, Оманы. Але ў звычным месцы іх чакаў жорсткі аблом...

22 — Граждане! Справляйте нужду в специально отведенных местах!

23 — За дабл бабкі плацінь! Фашысты! А хрэна, каб і былі..

Вядома, заўсёды ёсьць людзі, для якіх грошы ня пахнуць...

24 — Ёсьць яшчэ месьцейка, дзе можна здліць...

25 — Гэтым месьцейкам быў, канешне, пяцізоркавы дабл у МакДональдсе. Толькі б таварышы ня бачылі. За гэта ж можна й партбілет на стол..

26 — Але ж як добра, што ёсьць дабл Дональдс!!

«Таварыш! Наведваючы дабл Дональдс, ты б'еш у пах імпэрыялістычнага драпежніка!..»

З рэзалюцыі 4 канфэрэнцыі «Чырвонага Жонду»

Аўтар сцэнару Віктар Мао
Рэжысэр-пастаноўшчык Паўлюк Канавальчык
Фотаапэратар Данік Жылінскі
У ролях:
Мао, Паўлюк, Улад, Валік, Саша-Младшой, Юра і інш.

Навінкі № 4-5, 1998